| Сюжетно-ролевая игра по произведению С. Михалкова «А что у вас?» | **А что у вас?**<br>Наша мама<br>Отправляется в полет,<br>Потому что наша мама<br>Называется — пилот!<br>С лесенки ответил Вова:<br>— Мама — летчик?<br>Что ж такого?<br>Вот у Коли, например,<br>Мама — милиционер!<br>А у Толи и у Веры<br>Обе мамы — инженеры!<br>А у Левы мама — повар!<br>Мама-летчик?<br>Что ж такого?<br>— Всех важней, — сказала Ната, —<br>Мама — вагоновожатый,<br>Потому что до Зацепы<br>Водит мама два прицепа.<br>И спросила Нина тихо:<br>— Разве плохо быть портнихой?<br>Кто трусы ребятам шьет?<br>Ну, конечно, не пилот!<br>Летчик водит самолеты —<br>Это очень хорошо!<br>Повар делает компоты —<br>Это тоже хорошо.<br>Доктор лечит нас от кори,<br>Есть учительница в школе.<br>Мамы разные нужны,<br>Мамы разные важны.<br>Дело было вечером,<br>Спорить было нечего.<br>*С. Михалков (перераб.).* |
| *Творческий конкурс «Для мамы я танцую и пою» | **Вот какая мама**<br>Мама песню напевала,<br>Одевала дочку,<br>Одевала-надевала<br>Белую сорочку.<br>Белая сорочка —<br>Тоненькая строчка.<br>Мама песенку тянула,<br>Обувала дочку.<br>По резинке пристегнула<br>К каждому чулочку.<br>Светлые чулочки<br>На ногах у дочки.<br>Мама песенку допела,<br>Мама девочку одела:<br>Платье красное в горошках,<br>Туфли новые на ножках...<br>Вот как мама угодила —<br>К Маю дочку нарядила.<br>Вот какая мама —<br>Золотая прямо!<br>*Е. Благинина.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 15 «Весна. Перелетные птицы»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Подвижная игра «Вороны» | **Загадка**<br>Сильная, большая птица<br>Даже кошки не боится!<br>Очень важная персона —<br>Черно-серая ... (*ворона*). |
| Гульня «Грак» | **Лічылка**<br>Апранае грак<br>Чорны-чорны фрак,<br>Будзе дырыжорам<br>У сарочым хоры.<br>*Н. Галіноўская.* |
| Подвижная игра «Зимующие и перелетные птицы» | **Загадки**<br>На шесте — дворец,<br>Во дворце — певец,<br>А зовут его ... (*скворец*).<br><br>Солнце греет у порога,<br>И растаяли сугробы,<br>Потекли рекой ручьи,<br>Прилетели к нам ... (*грачи*).<br><br>Кто без ног и без свирели<br>Лучше всех выводит трели,<br>Голосистее, нежней?<br>Кто же это?<br>(*Соловей*) |
| *Рисунки на асфальте «Весна идет» | Ажылі прамяні<br>Замець не гуляе,<br>І мароз аслаб.<br>Раніцаю чутна:<br>Кап... Кап... Кап...<br>З крышталёвым бляскам<br>Звоняць капяжы.<br>Верабейка скача:<br>— Жыў!.. Жыў!.. Жыў!..<br>Прыляцелі з поўдня<br>Спеўныя шпакі.<br>Зазвінелі ў небе<br>Жаўранкаў званкі.<br>На паляне ціхай<br>У густым бары<br>Ажылі пралескі —<br>Весніх дзён сябры.<br>*П. Прануза.* |
| Наблюдение за изменениями природы весной | **Вясна**<br>Бяжыць без прыпынкаў зіма,<br>Нідзе ёй спакою няма.<br>Вясна падганяе:<br>— Хутчэй!..<br>І сонейка свеціць ярчэй.<br>Гавораць вясне капяжы:<br>— Шпарчэй ты на поўнач бяжы:<br>Шыбуе вясна на чаўне!<br>Дарогу, дарогу вясне!<br>*Н. Галіноўская.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| | ***<br>Маладая вясна,<br>Залатая пара!<br>Будзь красна і ясна,<br>Не шкадуй нам дабра!<br>*Я. Колас.*<br><br>***<br>Уцякай, мароз-дзядуля!<br>Чуеш ты, стары, ці не?<br>На пагорках — булі-гулі! —<br>Песні чуюцца вясне.<br>*Я. Колас.*<br><br>***<br>Жавароначкі, прыляціце,<br>Вясну красную прынясіце,<br>Каб сонейка засвяціла,<br>Каб снег белы растапіла,<br>Каб садзікі расквяціла.<br>*(Вусная народная творчасць.)* |
| Дидактическая игра «Мяч передавай — перелетную птицу называй» | **Загадки**<br>Прилетает к нам с теплом,<br>Путь проделав длинный.<br>Лепит домик под окном<br>Из травы и глины.<br>(*Ласточка*)<br><br>Он живет на крыше дома —<br>Длинноногий, длинноносый,<br>Длинношеий, безголосый.<br>Он летает на охоту<br>За лягушками к болоту.<br>(*Аист*)<br><br>Брюшко в крапинках как будто,<br>Он поет, бывает, утром.<br>У птицы невысокий рост,<br>Называют ее ... (*дрозд*).<br><br>Воздух режут без усилья,<br>Как серпы, кривые крылья.<br>Промелькнет — не разглядишь,<br>Так летает только ... (*стриж*). |
| Трудовые поручения | **Шпак**<br>На бярозцы пад акном<br>Я шпаку прыладзіў дом.<br>Толькі адысці паспеў —<br>Шпак адразу прыляцеў.<br>Дом утульны аглядае,<br>Песню весела спявае.<br>У шпака ёсць у двары<br>Вельмі добрыя сябры.<br>*Т. Кляшторная.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 16 «Праздники и традиции белорусского народа»

| Форма | Художественное слово |
| --- | --- |
| Беларуская народная гульня «Прэла-гарэла» | Як брала вясна ў сонца ключы,<br>Адчыняла сырую зямельку,<br>Пускала на свет траву-мураву,<br>Адзявала у лісце бярозы.<br>Ці трэба нам вясна-красна?<br>Трэба!<br>*(Вусная народная творчасць.)*<br><br>***<br>Мы вясну чакаем,<br>Мы вясну гукаем:<br>— Прыходзь, вясна!<br>З ручайком бурлівым,<br>З рэчкай гаманлівай,<br>Прыходзь, вясна!<br>*А. Дзеружынскі.* |
| *Творчыя эцюды «На Вялікдзень» | ***<br>Вярба — хлёст, б’е да слёз,<br>Не я б’ю, вярба б’е.<br>За тыдзень — Вялікдзень.<br>Будзьце здаровы, як тая вярба. (*2 р.*)<br>Слухайце бацьку,<br>Слухайце маці.<br>Не забывайце ўсім памагаці!<br>Старэнькім, маленькім<br>Ці хворым можа,<br>А вам усім няхай Бог дапаможа!<br>*(Вусная народная творчасць.)*<br><br>**Вялікдзень**<br>Вялікдзень, Вялікдзень —<br>Цудоўнейшы дзень!<br>Як сонейка ўзыдзе,<br>Адступіцца цень!<br>Хто ў нядолі,<br>Хто ў бядзе —<br>Сонейка да тых ідзе,<br>Бо шануе нас усіх,<br>Як дзяцей сваіх.<br>Вялікдзень, Вялікдзень —<br>Цудоўнейшы дзень!<br>*А. Вольскі.* |
| Наблюдение за весенней погодой. Солнце, облака, ручейки | **Свяці, свяці, сонейка**<br>Свяці, свяці, сонейка,<br>Каб нам было цёпленька.<br>Ай, люлі, люлі,<br>Люленькі-люлі.<br>Свяці, свяці, сонейка,<br>Дары ласку шчодранька,<br>Ай, люлі, люлі,<br>Люленькі-люлі.<br>*(Вусная народная творчасць.)* |



Скачано с сайта *aversev.by*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| | **Жавароначкі, прыляціце!**<br>Жавароначкі, прыляціце!<br>Вясна-красна на ўвесь свет!<br>Вясну красную прывядзіце!<br>Ідзе вясна, йдзе красна!<br>А зімушку праганіце!<br>Вясна-красна на ўвесь свет!<br>Бо зімушка надаела,<br>Ідзе вясна, йдзе красна!<br>Многа хлебушка пераела,<br>Вясна-красна на ўвесь свет!<br>*(Вусная народная творчасць.)*<br><br>**Вясна-красна**<br>А кропелькі-крошачкі<br>Паскакалі трошачкі.<br>Па сцяжынках скок ды скок<br>І пабеглі ў ручаёк.<br>Ручаёк расце, расце,<br>З беражкоў вада цячэ.<br>*Я. Жабко.* |
| Сюжэтна-ролевая гульня «Масленіца» | У нас сёння Масленіца!<br>Прыляцела ластавіца!<br>Села-пала на калу,<br>Кідала масла па каму.<br>А мы Масленку чакалі —<br>Усю нядзельку выглядалі.<br>А мы думалі Масленка<br>Сем нядзелек,<br>Ажно Масленка сем дзянёчкаў!<br><br>*Ход: сям'я рыхтуецца да свята, выпякаюць бліны.*<br>*Члены сям'і (прагаворваюць):*<br>У нас сёння Масленіца!..<br>*Уваходзяць Сонейка і Вясна.*<br>*Сонейка:*<br>Я — Сонейка яркае,<br>Я — Сонейка краснае.<br>Зямлю саграваю,<br>Прывітанне ёй дасылаю,<br>Вясну заклікаю,<br>Шчасця й радасці ўсім жадаю!<br>*Члены сям'і (кланяюцца):*<br>Прывітанне, Сонейка вясновае!<br>Забяры маразы ты зімовыя!<br>Просім, Сонейка, край родны<br>Абудзіць і абагрэць!<br>*Вясна:*<br>А зараз я загадаю вам загадкі пра веснавыя асаблівасці: «Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць. (*Гром.*) У адным доме сотні жыхароў, а сям'я адна. (*Вулей.*) Доўгі насок, тонкі галасок, хто яго заб'е, той сваю кроў пралье. (*Камар.*) Чоран, ды не воран, рагаты, ды не бык, шэсць ног без капыт, ляціць — вые, сядзе — зямлю рые. (*Жук.*) Сем тысяч майстроў зрабілі хату без акон і без вуглоў. (*Мурашкі.*) Ля дарогі — шарык белы, вецер дзьме, а шарык цэлы, а як дзьмухнуць хлапчукі — пух ляціць ва ўсе бакі. (*Дзьмухавец.*) У чырвоных ботах ходзіць па балотах. (*Бусел.*) |



Скачано с сайта *aversev.by*

*Окончание таблицы*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| | *Выходзіць Масленіца:*<br>З Масленкай вас, ды вясёлаю,<br>З вясной яснай,<br>З долечкай шчаснай!<br>*Карагод пад вясёлую музыку.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 17 «Природа и человек»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Квест — наблюдение на экологической тропе | **Народны каляндар**<br>Вясной прапусціш — летам не дагоніш.<br>На дзень раней пасееш — на тыдзень раней збярэш.<br>Вясна-красна багата кветкамі, а лета — снапамі.<br>Сакавік часам снегам сее, а часам сонцам грэе.<br>Сухі сакавік, цёплы красавік, мокры май — будзе добры ўраджай.<br>Жаваронак прылятае на праталіну, шпак — на прагаліну, жораў — з цяплом, ластаўка — з лістом. |
| Гульня — драматызацыя па змесце верша Л. Дайнекі «У вясновым лесе» | **У вясновым лесе**<br>Пойдзем, дзеці, у лес вясновы,<br>Нібы ў дом вясёлы, новы.<br>Толькі тым, хто ў казку верыць,<br>Лес свае адчыніць дзверы.<br>Там пад дубам зайчаняткі<br>Дружна робяць фіззарадку,<br>Там ваўкі яшчэ ад рання<br>Сена косяць на сняданне.<br>Там з імпэтам і запалам<br>Лось іграе на цымбалах,<br>Там мядзведзь каля балота<br>Рамантуе буслу боты.<br>Песні там і смех усюды.<br>Але ведайце, што цуды<br>Толькі тым вясна пакажа,<br>Хто не скрыўдзіць і мурашкі,<br>Хто з прыродаю сябруе,<br>Птушак і звяроў шануе.<br>*Л. Дайнека.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 18 «Космос. Планета Земля»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Игра-эстафета «Космонавты» | **Касманаўт**<br>Прабіцца ў космас чалавек<br>Спрадвеку меў імкненне.<br>І вось нарэшце перасек<br>Зямное прыцягненне.<br>*У. Корбан.* |
| Беларуская народная гульня «Сонца і месяц» | **Загадки**<br>В дверь, в окно стучать не будет, а войдет и всех разбудит.<br>(*Солнце*)<br><br>Светит, сверкает, всех согревает.<br>(*Солнце*)<br><br>Освещает ночью путь,<br>Звездам не дает заснуть.<br>Пусть все спят, ей не до сна,<br>В небе светит нам ... (*луна*).<br><br>Горкай, горкай, горачкай<br>Ішоў малы Ягорачка.<br>Ваўкоў не баяўся,<br>Страхаў не пужаўся.<br>Горкай, горкай, горачкай<br>Ішоў наш Ягорачка.<br>Ішоў ён лугам,<br>Вёў дзяцей кругам.<br>*(Вусная народная творчасць.)* |
| Наблюдение за изменениями в погоде | **Жывая планета**<br>Кружляе ў Сусвеце бясконцым<br>Між зораў планета Зямля,<br>Якая вялікасным Сонцам<br>Для нас абагрэта здаля.<br>Вада ёсць на нашай планеце,<br>Паветра — нам дыхаць з табой.<br>Адзіную толькі ў Сусвеце<br>Яе называюць жывой<br>Ды, пэўна, у Космасе дзіўным<br>Чакае зямлян адкрыццё,<br>Якое мы зведаць павінны:<br>Ёсць дзесьці таксама жыццё.<br>*М. Пазнякоў.* |
| Дидактическая игра с мячом «Я — планета Земля, а ты — моя часть» | **Загадка**<br>Нет планеты краше и милей.<br>Для животных, насекомых, птиц, людей...<br>Реки, горы и бескрайние поля<br>На планете, что зовем ... (*Земля*). |
| Сюжетно-ролевая игра «Полет в космос» | **Планета дзяцей**<br>Так на свеце ўжо вядзецца,<br>Што дзяцінства нам даецца,<br>У жыцці даецца раз.<br>Гэта самы светлы час.<br>Хай жа стане<br>Планета людзей<br>Цудоўнай планетай<br>Шчаслівых дзяцей! |



Скачано с сайта *aversev.by*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| | Каб сабраць на свеце гора<br>Ды схаваць глыбока ў мора,<br>Вось бы весела было,<br>Шчасце ў кожны б дом прыйшло!<br>Хай жа стане<br>Планета людзей<br>Цудоўнай планетай<br>Шчаслівых дзяцей!<br>Каб спыніць на свеце войны,<br>Стаў бы кожны дзень спакойны.<br>Гэта лепшая з надзей<br>І дарослых, і дзяцей.<br>Хай жа стане<br>Планета людзей<br>Цудоўнай планетай<br>Шчаслівых дзяцей!<br>*А. Грачанікаў.* |
| Дидактическая игра «Космическая математика» | **Лічылка**<br>Раз, два, тры,<br>Мы — найлепшыя сябры.<br>Тры, чатыры, пяць,<br>Будзем космас штурмаваць.<br>Шэсць, семь, восемь, дзевяць, дзесяць,<br>Паляцім на Марс і Месяц! |
| *Мини-проект «Беларусь космическая» | **Шлях да зорак**<br>Хлопчык з палескай вёскі<br>Лятаў на лыжах з горкі,<br>А ў сэрцайка запала<br>Святло далёкай зоркі.<br>На караблі касмічным<br>Збылася мара з часам —<br>Лыжня крутая стала<br>Пачаткам зорнай трасы.<br>Хапае ў родным краі<br>Трамплінаў — снежных горак,<br>Каб з іх і вам падняцца<br>Лягчэй было да зорак.<br>*М. Маляўка.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 19 «Растения нашего детского сада»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Рухомая гульня «Грушка» | **Грушка**<br>Мы пасадзім грушку<br>Усе, усе.<br>Няхай наша грушка<br>Расце, расце.<br>Вырасці ты, грушка,<br>Вось такой вышыні,<br>Распусціся, грушка,<br>Вось такой шырыні!<br>Расці, расці, грушка,<br>Ды ў добры час.<br>Патанцуй, Марылька,<br>Паскачы для нас.<br>А ўжо наша грушка<br>Распусцілася,<br>А наша Марылька<br>Зажурылася.<br>А мы тую грушку<br>Весяліць будзем.<br>І ад нашай грушкі<br>Уцякаць будзем. |
| Квест — наблюдение на экологической тропе | **Загадки**<br>Она кустиком растет<br>И сиренево цветет,<br>Правда, иногда бывает,<br>Белым цветом расцветает.<br>Ее цветки душистые<br>И четырехлучистые.<br>(*Сирень*)<br><br>Весной зеленела,<br>Летом загорела,<br>Осень в сад пришла,<br>Красный факел зажгла.<br>(*Рябина*)<br><br>Пахучим сладким цветом<br>Ты каждый год цветешь.<br>И мед свой жарким летом<br>Ты пчелам отдаешь.<br>(*Липа*)<br><br>Сучки рогатые,<br>Плоды крылатые,<br>А лист — ладошкой,<br>С длинной ножкой.<br>(*Клен*)<br><br>**Народный календарь**<br>Рябина зацветает — пора сеять лен.<br>Хорошо рябина цветет — к урожаю льна.<br>Если у клена листья распускаются позже, чем у березы, то лето будет засушливое. |



Скачано с сайта *aversev.by*

*Окончание таблицы*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Гульнявое практыкаванне «Назаві слоўца» | **Дуб**<br>Распусціўшы сучча<br>У глухім прыволлі,<br>Сам адзін расце ён<br>На далёкім полі.<br>Як цар, у кароне,<br>Аб нічым не дбае,<br>Ці то стогне бура,<br>Ці віхор гуляе.<br>На адным ён месцы<br>Днюе і начуе;<br>Многа казак знае,<br>Многа песень чуе.<br>Дождж падмыў карэнне;<br>Ў ім дупло — як хата...<br>Ён стаіць і дрэмле —<br>Грозны, расахаты.<br>*Я. Купала.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 20 «Цветы и насекомые»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Подвижная игра «Домики для цветов» | **Верш-загадка**<br>Яму прырода падарыла<br>Нябёс жывую сіняву,<br>У непагоду навучыла<br>Трымаць высока галаву.<br>(*Васілёк*)<br>*М. Пазнякоў.* |
| Игровое упражнение «Кто как передвигается» | **Загадки**<br>Ранним утром ей не спится:<br>Очень хочется трудиться.<br>Вот и меду принесла<br>Работящая ... (*пчела*).<br><br>Кто с ногами влез в варенье,<br>Да еще без разрешенья,<br>И жужжит все возле уха?<br>Надоедливая ... (*муха*).<br><br>С неба в гости прилетела.<br>На цветочек мамин села.<br>Крылышки в горошек,<br>Шесть прекрасных ножек.<br>Черная головка — ... (*божья коровка*).<br><br>Прыг да скок — не человечек,<br>Прыгает в траве ... (*кузнечик*). |
| Квест-игра (наблюдение) «Насекомые» | **Загадкі**<br>Чорны, ды не воран,<br>Рагаты, ды не бык,<br>Шэсць ног без капыт,<br>Ляціць — вые,<br>Сядзе — зямлю рые.<br>(*Жук*)<br><br>Жыве на кветцы чырвоная казюлька,<br>У чорных кропках на спінцы кашуля.<br>Па сцябле паўзе вельмі хутка і спрытна,<br>А завецца яна — божая ... (*кароўка*).<br><br>У палоску сукенку яна надзела<br>І да кветачак паляцела.<br>Доўга з іх нектар збірала,<br>Каб мёду ў вуллі больш стала.<br>(*Пчала*)<br><br>**Жук**<br>Цераз тын,<br>Цераз плот<br>Жук ляціць у агарод<br>І гудзе, як самалёт.<br>Ну і жук!<br>Ну і гук!<br>*А. Пысін.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

*Окончание таблицы*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Игровое упражнение «Цветы Красной книги Республики Беларусь» | **Загадки**<br>Дальний лес стоит стеной,<br>А в лесу, в глуши лесной<br>На суку сидит сова,<br>Там растет ... (*усни-трава*).<br>*И. Токмакова.*<br><br>Разбрелись в лесу сестрицы,<br>Синеглазки ... (*медуницы*). |
| Трудовые поручения «В цветнике» | **Рамонка і адуванчык**<br>Запыталася<br>Рамонка<br>Галаском<br>Дзіцячым,<br>Тонкім:<br>— Адуванчык,<br>Мой браточку,<br>А дзе твае<br>Валасочкі?<br>— Адкажу<br>Табе я, слухай —<br>Сам па ветры<br>Іх раздзьмухаў,<br>Па зямлі<br>Я іх рассеяў,<br>Бо яны,<br>Яны ж насенне.<br>*А. Дзеружынскі.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 21 «Животные жарких стран»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Игра-эстафета «Кто быстрее соберет бананы, кокосы» | В жарких странах носороги<br>Просто ходят по дороге.<br>Мокнут в речке бегемоты.<br>Львы выходят на охоту.<br>Крокодилы, обезьяны,<br>Зебры — жители саванны.<br>И тропические птицы...<br>Есть чему тут подивиться!<br>*В. Нищеева.* |
| Подвижная игра «Зебры, львы, слоны и другие» | **Загадки**<br>Он высокий и пятнистый,<br>С длинной-длинной шеей,<br>И питается он листьями —<br>Листьями деревьев.<br>(*Жираф*)<br><br>Неуклюжий и большой,<br>Он пасется под водой.<br>Набивая свой живот,<br>Щиплет травку ... (*бегемот*).<br><br>Он в трубу свою гудит и,<br>как дом большой, бежит.<br>(*Слон*)<br><br>Уж очень вид у них чудной:<br>У папы — локоны волной,<br>А мама ходит стриженой.<br>На что она обижена?<br>(*Лев, львица*)<br><br>По реке плывет бревно.<br>Ох и злющее оно!<br>Тем, кто в речку угодил,<br>нос откусит ... (*крокодил*).<br><br>Я такая заводная,<br>Я проказница такая,<br>Мне сидеть на месте лень,<br>Прыгаю в лесу весь день.<br>(*Обезьяна*) |
| Наблюдение за бабочкой | **Загадка**<br>Спал цветок и вдруг проснулся —<br>Больше спать не захотел.<br>Шевельнулся, встрепенулся,<br>Взвился вверх и улетел.<br>(*Бабочка*)<br><br>**Закликалочка**<br>Бабочка-коробочка,<br>Полети на облачко,<br>Там твои детки —<br>На березовой ветке.<br>*(Устное народное творчество.)* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 22 «Архитектура»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Игра-эстафета «Юные строители» | **Новый дом**<br>Грузовик привез, рыча,<br>Полный кузов кирпича.<br>А другой привез шофер<br>Щебень, известь и раствор.<br>Звон и гром стоят кругом.<br>Быстро строят новый дом.<br>Он уже почти готов,<br>И бригада маляров<br>Красит в синий цвет фасад:<br>В доме будет детский сад.<br>*Л. Рашковский.* |
| Наблюдение за муравьями | **Загадка**<br>Он работник настоящий,<br>Очень, очень работящий.<br>Под сосной в лесу густом<br>Из хвоинок строит дом.<br>(*Муравей*)<br><br>Небывалы ўзняўся дом<br>Паміж хвояў пад кустом<br>Небывалы ўзняўся дом.<br>Сто ўваходаў, сто дзвярэй<br>Для дарослых і дзяцей.<br>Сто паверхаў, сто падлог,<br>Каля дому тупат ног.<br>Ад зары і да зары<br>Тут працуюць жыхары.<br>— Гэй, з дарогі,<br>Дайце шлях,<br>Дуб нясу я на плячах!<br>Хто з калодай,<br>З бервяном —<br>Тупацяць мурашкі ў дом.<br>А ў калысках у цішы<br>Спяць малыя мурашы.<br>*А. Пысін.* |
| Дидактическая игра «Я — целое, а ты — моя часть» | **Загадкі**<br>Стаіць сасна,<br>На сасне лён,<br>На льне жыта.<br>(*Стол, абрус, хлеб*)<br><br>Белая кабыла<br>Увесь лес пераела.<br>(*Печ*) |
| Сюжетно-ролевая игра «Строители» | **Строители**<br>Пусть не сердятся родители,<br>Что измажутся Строители,<br>Потому что тот, кто строит,<br>Тот чего-нибудь да стоит!<br>И неважно, что пока<br>Этот домик из песка!<br>*Б. Заходер.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

*Окончание таблицы*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Сюжетно-ролевая игра «Экскурсия по городу» | **Загадки**<br>Если хочешь умным стать,<br>Нужно много книг читать.<br>Чтоб найти все книги века,<br>Приходи в ... (*библиотеку*).<br><br>В нем предметы старины<br>До сих пор сохранены.<br>Любознательный народ<br>Поглазеть на них идет.<br>(*Музей*) |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 23 «Солнце, воздух и вода — наши лучшие друзья»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Игры на зеленой зоне «Ходим по дорожке босиком» | **Что за диво?**<br>Ножки встали на дорожку.<br>На дорожку не простую,<br>На веселую такую!<br>По мосточку мы пойдем,<br>Ножки наши разомнем.<br>Вот, следочки перед нами,<br>Ну-ка, прыгнем поскорей! |
| Подвижная народная игра «Солнце» | **Лічылка**<br>Сонейка свеціць<br>Ад ранку да вечара.<br>Сонейка грэе<br>Ад ранку да вечара.<br>Хоча яно, каб шумелі сады,<br>Каб у садах спелі дзецям плады. |
| Наблюдение за летним ветром, дождем, радугой | **Заклічкі**<br>Дожджык, дожджык<br>палівай,<br>Дай нам бульбы<br>Ураджай.<br>*(Вусная народная творчасць.)*<br><br>Радуга-дуга!<br>Не давай дождя!<br>Давай солнышка-колоколнышка!<br>*(Устное народное творчество.)*<br><br>Дождик, дождик, капелька,<br>Водяная сабелька.<br>Лужу резал, лужу резал,<br>Резал, резал, не разрезал.<br>*И. Токмакова.*<br><br>**Загадка**<br>Крашеное коромысло<br>Над рекой повисло.<br>(*Радуга*) |
| Опыт «Радуга» | **Загадка**<br>Что за чудо-коромысло<br>После дождика повисло?<br>Очень яркое, цветное,<br>А красивое какое!<br>(*Радуга*) |
| *Міні-праект «Беражы зямлю і неба» | **Беражы зямлю і неба**<br>Нам цёпла ў свеце дабрыні:<br>Тут сонца матчынай усмешкі,<br>Аблокі ў сіняй вышыні,<br>Мурашніка жывыя сцежкі.<br>І хто ж не любіць ясных дзён?<br>Спявае жаваранак шчыра,<br>Званок вясны усім чуцён.<br>Мы — дзеці дружбы, мы —дзеці Міру! |



Скачано с сайта *aversev.by*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| | Іскрыцца колерамі снег<br>Вясёлак, берасцянак, мяты<br>...Ды ў кожным доме ёсць партрэт<br>Забітага вайной салдата.<br>І просяць дзеці ўсёй зямлі,<br>Алесі, Патрыкі, Індзіры,<br>Каб людзі неба зберaглі.<br>Мы — дзеці дружбы, мы — дзеці Міру!<br><br>І самі будзем берагчы<br>І кожны кут, і кожны лісцік —<br>Ад цемры вечнае начы,<br>Адкуль няма нікому выйсця.<br>Няхай збіраюць пчолы мёд,<br>Вінтоўкі будуць толькі ў ціры!<br>Сябры, ідзіце ў карагод!<br>Мы — дзеці дружбы, мы — дзеці Міру!<br>*Э. Агняцвет.* |
| Дидактическая игра «Хорошо — плохо» | **Навальніца**<br>Навальніца, навальніца,<br>Неба можа абваліцца.<br>Гром грыміць,<br>Маланкі блішчуць,<br>Лупіць дождж,<br>А вецер — свішча!<br>Годзе вам усім сварыцца!<br>Сціхні, сварка-навальніца!<br>*П. Марціновіч.* |
| Игровое упражнение «Назови и расскажи» | **Дождждык**<br>Дожджык, дожджык залаты,<br>Ліся, цёплы і густы,<br>На сады і на палеткі,<br>І на травы, і на кветкі,<br>Палівай гароды болей,<br>Дзе расце гарох, фасоля...<br>*К. Буйло.* |
| Игра-театрализация | **Ветер**<br>Осторожно ветер<br>Из калитки вышел,<br>Постучал в окошко,<br>Пробежал по крыше;<br>Поиграл немного<br>Ветками черемух,<br>Пожурил за что-то<br>Воробьев знакомых.<br>И расправив бодро<br>Молодые крылья,<br>Полетел куда-то<br>Вперегонку с пылью.<br>*М. Исаковский.* |



Скачано с сайта *aversev.by*

## Планкарта № 24 «Лето в народных приметах»

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| Гульня «Белыя гусі» | **Народныя прыкметы**<br>Гусі высока ляцяць — чакайце дажджлівае надвор'е.<br>Если заметили на листьях ивы капельки воды — жди грозы.<br>Если ель спрятала шишки и опустила ветви вниз, значит, надвигается очень сильный дождь. |
| Подвижная игра «Солнышко и дождик» | **Народные приметы**<br>Клен «плачет» — к дождю.<br>Цветы издают сильный запах — к дождю.<br>Муравьи быстро работают — день будет очень хороший и ясный.<br>Муравьи прячутся в кору дерева, муравейник — дождь пойдет.<br>Ворон летит и каркает — к дождю. |
| Назіранне на экалагічнай сцежцы з выкарыстаннем беларускіх народных прыказак | **Прыказкі**<br>Людзі рады лету, а пчолы — квету.<br>Улетку кожны кусцік начавацьпусціць.<br>Летні дзень зіму корміць.<br>Летам празапасім — зімой знойдзем.<br>Трэба ўлетку назбіраць, каб зімой было што жаваць.<br>Што лета назбірае, то зіма паз'ядае.<br>Што летам народзіцца, то зімой згодзіцца.<br>Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.<br>Хто ў ліпені на полі пацее, таго ўзімку і печка нагрэе. |
| *Гульня — драматызацыя па змесце фальклорнага свята «Дажынкі» | *Гаспадар пытаецца, дзеці адказваюць:*<br>— Чым багата хата?<br>— Хлебам і Радзімай.<br>— А адкуль узыходзіць сонца?<br>— З-за хаты!<br>— А хлеб?<br>— З пякной дзяжы.<br>— А як той хлеб трэба есці?<br>— Разам за сталом.<br>— А дзе яго ўзяці?<br>— Ісці ў поле жаці!<br>*Жнейкі:*<br>— Канец ніўцы, канец,<br>Спляцем гаспадару вянец.<br>Няхай лепшае ідзе<br>І вяночак надзяе.<br>— Будзь, сяло, весяло!<br>Бо мы вяночак несямо.<br>З добрага жыта,<br>Вельмі красавіта.<br>— Адчыняй нам, гаспадар, вароты,<br>Ідуць жнейкі з работы.<br>— Адчыняй і другія,<br>Ідуць жнейкі маладыя!<br>— Засцілай, гаспадыня, сталы і лавы,<br>Едзе ў хату госць небывалы.<br>*(Аддаюць сноп.)*<br>Гаспадыня:<br>— Доля на вянку,<br>Хлеб на рушніку —<br>Кветкам пакланяецца,<br>З вамі вітаецца. |



Скачано с сайта *aversev.by*

*Окончание таблицы*

| Форма | Художественное слово |
|---|---|
| | Дзякуй вам, жнейкі,<br>Што рана ўставалі,<br>Рана ўставалі,<br>Шчыра працавалі.<br>*(Кланяецца ўсім.)*<br>*Гаспадыня (частуе ўсіх караваем):*<br>— Гэта вам, жнейкі. |
| *Міні-праект «Беларусь — мая Радзіма» | Плыве ў блакіце белы бусел,<br>І луг квяцісты, як абрус,<br>А мы з табою — беларусы!<br>Радзіма наша — Беларусь!<br>*М. Пазнякоў.*<br><br>***<br>Зямля з блакітнымі вачамі —<br>Святло азёр, прастор лугоў!<br>Тут называюць Васількамі<br>На Беларусі хлапчукоў.<br>*Э. Агняцвет.*<br><br>***<br>Непаўторны ён, адзіны,<br>Найпрыгожы — родны край.<br>Дыхай водарам Радзімы<br>І ў душу красу ўбірай.<br>*М. Пазнякоў.* |



Скачано с сайта *aversev.by*